УДК 271.4(476):940

**Л. І. Масейчук**
Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт

# РАЗВІЦЦЁ АДУКАЦЫЙНАЙ СІСТЭМЫ БАЗІЛІЯНСКАГА ОРДЭНА Ў XVIII СТ.

У артыкуле разглядаюцца розныя віды адукацыйных устаноў (навіцыяты, сярэднія і парафіяльныя школы), якія дзейнічалі пад юрысдыкцыяй базіліянскага ордэна. Падкрэсліваецца, што школьная сістэма ордэна была пабудавана па ўзоры езуіцкай адукацыйнай мадэлі. У яе аснову быў пакладзены прынцып бясплатнасці і бессаслоўнасці. Вучняў навучалі гісторыі, эканоміцы, арыфметыцы, асновам геаметрыі, старажытна-габрэйскай і царкоўнаславянскай мовам. Да канца XVIII ст. сярэднія школы былі адкрыты пры 21 манастыры ордэна. Вышэйшыя курсы навук выкладаліся ў 14 школах.

**Ключавыя словы:** семінарскія заняткі, базіліянскі ордэн, уніяцкае святарства, гісторыя адукацыі.

**L. I. Maseichuk**
Belarusian State Medical University

# DEVELOPMENT OF THE BASILIAN EDUCATIONAL SYSTEM ORDER IN XVIII CENTURY

The article discusses the various types of educational institutions (novices, secondary and parish schools) operating under the jurisdiction of the Basilic Order. It is emphasized that the school system of the order was built on the model of the Jesuit educational model. It was based on the principle of free and wordlessness. Students were taught history, economics, arithmetic, the basics of geometry, ancient Hebrew and Church Slavonic languages. By the end of the XVIII century. high schools were opened at 21 convents of the order. Higher courses of science were taught in 14 schools.

**Key words:** seminars, colloquium, university, basilian order, uniate clergy, auditory lessons, history of education.

**Уводзіны.** З часу заснавання базіліянскага ордэна ў гісторыі беларускай асветы пачалася новая эпоха. Яна характарызавалася тым, што заснавальнікамі і арганізатарамі асветных сродкаў уніяцкай царквы з'яўляліся базіліяне.

Асновы адукацыйнай ідэалогіі ордэна заклаў уніяцкі мітрапаліт Іосіф Вельямін Руцкі (1613–1637). Ён лічыў, што ўніяцкія школы патрэбна ствараць па ўзоры езуіцкіх вучэбных устаноў на роўных з імі правах і прывілеях. У 1613 г. мітрапаліт заручыўся падтрымкай свецкіх улад, атрымаўшы ад караля Жыгімонта ІІІ (Вазы) (1587–1632) прывілей на заснаванне ўніяцкіх школ у Рэчы Паспалітай. У 1615 г. Іосіф Руцкі дамогся таго, што папа рымскі Павел V ураўнаў статус уніяцкіх школ з езуіцкімі.

Згодна з пастановамі, прынятымі на першай кангрэгацыі базіліянскага ордэна ў г. Навагрудку ў 1617 г. і зацверджанымі папам Урбанам VIII (1623–1644) у брэве «Exponi nobis» у 1631 г., за манахамі-базіліянамі было замацавана права выхавання і навучання свецкіх юнакоў, а таксама манаствуючага ўніяцкага духавенства [1, с. 167].

У аснову адукацыйнай мадэлі быў пакладзены прынцып бясплатнасці і бессаслоўнасці. Аднак, у адрозненне ад езуіцкіх вучэльняў, уніяцкія школы адчыняліся толькі пры базіліянскіх кляштарах, паколькі, паводле перакanання Іосіфа Руцкага, ісціныя навуковыя веды павінны быць гарманічна аб'яднаны з рэлігійнасцю [2, с. 116].

З 1621 г. кожны член базіліянскага ордэна павінен быў прайсці курс навучання ў навіцыяце. Унутраны лад, распарадак і адукацыйны працэс навіцыята рэгламентаваліся папскай булай ад 19 сакавіка 1603 г. аб уладкаванні навіцыятаў для ўсіх манаскіх ордэнаў каталіцкай царквы «De monarchum ordines» [3, s. 141].

**Асноўная частка.** У XVIII ст. навіцыяты дзейнічалі пры кляштарах у Антопалі, Бярэзвічах, Вільні, Віцебску, Жыровічах, Лаўрышаве, Лядах, Полацку. Вучыліся ў іх 2–4 гады па адной з трох спецыяльнасцей: тэалогія (багаслоўства), філасофія, рыторыка [4, s. 59].

Навіцыі штодзённа прысутнічалі на набажэнствах, навучаліся грамаце і чытанню на царкоўнаславянскай мове і лаціне, пачатковым ведам у арыфметыцы, знаёміліся «з царкоўнымі абрадамі і цырымоніямі», акрамя таго, «практыкаваліся цялесна» [5, с. 452]. Фізічныя практыкаванні праходзілі ў закрытым для староннiх садзе. Наведвальнікі маглі прыходзіць да навіцыя і размаўляць з ім толькі з дазволу настаўніка (магістра), які прысутнічаў падчас

размовы. Выхад за межы навіцыята быў дазволены не часцей за адзін раз на тыдзень, абавязкова ў суправаджэнні магістра.

Вялікая ўвага надавалася моўнай падрыхтоўцы выхаванцаў, якія вывучалі лаціну, старажытнаяўрэйскую, грэчаскую, царкоўнаславянскую, французскую і нямецкую мовы.

Выпускнікі навіцыята маглі працягваць адукацыю ў Віленскім, Венскім і Брунсбергскім алумнатах, а таксама ў Рымскай грэчаскай Афанасьеўскай калегіі, паколькі ў іх рознымі папскімі дэкрэтамі ўніятам было вылучана 20 месцаў. Тэрмін навучання ў вышэйпералічаных вучэбных установах для выпускнікоў навіцыятаў скаладаў усяго 2 гады [6, s. 31].

Правам засноўваць новыя школы-навіцыяты, праводзіць візітацыю дзейсных навучальных устаноў валодаў глава базіліянскай кангрэгацыі – протаархімандрыт.

Адукацыйная дзейнасць базіліян не абмяжоўвалася навучаннем паслушэнцаў. Пры кляштарах працавалі школы для свецкай моладзі, у якіх маглі навучацца і дзеці белага прыходскага кліру. Выхаванцы ў такіх навучальных установах разам са свабоднымі навукамі засвойвалі таксама і «навукі хрысціянскія» [4, s. 59]. Пачатковую адукацыю свецкія навучэнцы маглі атрымаць і ў малодшых класах манаскіх школ. Змешаныя школы функцыянавалі пры кляштарах у Вільні, Вярбілаве, Лядах, Талачыне [7, с. 96]. Навучанне ў такіх школах было пяцігадовым. Клас гуманітарных ведаў (2 гады навучання) быў абавязковым для ўсіх навучэнцаў. Пасля заканчэння першай ступені навучання паспяховы вучань, які жадаў прысвяціць сябе духоўнаму званню, мог перайсці ў клас рыторыкі (1 год), затым – у клас філасофіі або багаслоўства (працягласць навучання 2 гады).

У класе філасофіі выкладалі логіку, фізіку і курс метафізікі па працах Еўкліда; вывучалі філасофію Арыстоцеля і геаграфію. У класе багаслоўства, акрамя ўласна тэалагічных (Святога Пісання, маральнага багаслоўства, дагматычнай тэалогіі, кананічнага права і г. д.), выкладалі рукадзелле. Навучалі гісторыі, эканомікі, арыфметыцы, асновам геаметрыі, старажытнаяўрэйскай і царкоўнаславянскай мовам.

Важнае месца ў навучанні адводзілася рознага кшталту дыспутам. Яны праходзілі штотыдзень. На ўрачыстыя (пачатак і/або заканчэнне навучальнага года, царкоўныя святы і інш.) запрашаліся госці: гарадская адміністрацыя, прадстаўнікі епіскапата, настаяцелі ўніяцкіх кляштароў і інш. Распрацоўвалася да 40 палажэнняў, якія падлягалі абароне або абвяржэнню і абмяркоўваліся ў ходзе такога мерапрыемства [8].

Двойчы на год – да дня Святога Васілія і да пачатку навучання – багасловы і філосафы складалі вершы на лаціне. Тройчы на год багасловы, філосафы і рытары прамаўлялі казанні ў трапезнай пры зборы ўсіх насельнікаў кляштара. Для багасловаў і летнія вакацыі доўжыліся 2 месяцы, для рытараў і гуманістаў – месяц. Зімовыя вакацыі пачыналіся з 20 снежня і заканчваліся ў дзень памяці Святога Васілія. Адпачывалі таксама на «сырнай», «страстнай» і «светлай» сядміцы і 3 дні на «Пяцідзясятніцу»; для малодшых класаў адпачынак быў карацейшы.

Сярэднія школы (канвікты), якія працавалі пры кляштарах у Барунах, Бярэзвічах і Жыровічах, рыхтавалі свецкую моладзь да дзяржаўнай службы. Да канца XVIII ст. сярэднія школы былі адчынены пры 21 кляштары ордэна. Вышэйшыя курсы навук выкладаліся ў 14 школах [8].

Прыходскія (пачатковыя) школы базіліяне адчынялі неахвотна, паколькі іх утрыманне цалкам клалася на кляштар, пры якім яны функцыянавалі. Тым не менш у другой палове XVIII ст. такія школы працавалі пры Кобрынскім, Ракаўскім, Антапальскім, Паддубінскім і Малашкоўскім базіліянскіх кляштарах. У такіх школах вучыліся, як правіла, дзеці збяднелай шляхты, прыходскага ўніяцкага духавенства і сялян. Вучняў навучалі чытанню і пісьму, асновам арыфметыкі і «хрысціянскай навукі» [4, s. 59].

Паколькі базіліянскія школы (як свецкія, так і духоўныя) дзейнічалі пры кляштарах, то настаяцель выконваў абавязкі рэктара. Ён павінен быў сачыць за выкананнем вучэбнай праграмы і школьнага статута, клапаціцца пра фінансавы стан школы, здароўе выкладчыкаў і вучняў. З манахаў манастыра выбіраўся памочнік рэктара, які кантраляваў выкананне школьнага статута выкладчыкамі і вучнямі [2, с. 120].

Першапачаткова ва ўніяцкіх школах выкладалі выпускнікі езуіцкіх калегіумаў і Віленскай езуіцкай акадэміі («Almae Academia et Universitas Vilnensis Societatis Jesu»). Пазней, па меры развіцця грэка-каталіцкай адукацыйнай структуры, у школы пачалі прыходзіць выкладчыкі, якія скончылі базіліянскія навучальныя ўстановы. Большасць выкладчыкаў належала да базіліянскага ордэна. Разам з тым да работы ў свецкіх школах і школах змешанага тыпу прыцягваліся педагогі з міран.

Асабліва старанна базіліяне ставіліся да падрыхтоўкі і падбору настаўнікаў малодшых класаў навіцыятаў – магістраў. Магістрам мог стаць манах, не маладзейшы за 35 гадоў, член ордэна не меней за 10 гадоў, які меў пяцігадовую педагагічную практыку і рукапакладзены сан. Кандыдат на атрыманне прафесарскага звання павінен быў скончыць вышэйшую навучальную ўстанову і адпрацаваць на пасадзе

магістра не меньш за два гады. Прафесарамі філасофіі, напрыклад, маглі быць толькі асобы, якія мелі вучоную ступень па філасофіі, каб «выкладанне іх было больш грунтоўнае, бяспечнае і цуралася памылак» [9, с. 169]. Прафесары былі абавязаны, акрамя выкладчыцкай дзейнасці (асабліва настаўнікі багаслоўства і філасофіі), прамаўляць казанні ў храмах. Прэтэндэнт на пасаду прафесара здаваў дзвюхгадзінны экзамен, які складаўся з 40 пытанняў. Экзаменацыйныя пытанні не фармуляваліся загадзя і маглі датычыцца любога аспекту вучэбнай дысцыпліны. Да прафесараў дагматычнага багаслоўства па магчымасці прымацоўваліся 2 прафесары-памочнікі, адзін з якіх вытлумачваў Святое Пісанне і выкладаў старажытнаяўрэйскую мову, другі тлумачыў святыя каноны [8].

Вялікую ўвагу базіліяне надавалі царкоўнай казані. На пасаду прапаведнікаў прызначаліся пераважна асобы, якія атрымалі вышэйшую багаслоўскую адукацыю ў папскіх алумнатах. Асобам, якія не атрымалі тэалагічнай адукацыі, прапаведваць забаранялася. Казані-экспромты пры набажэнствах не ўхваляліся.

Базіліяне выступалі супраць цялесных пакаранняў вучняў, але актыўна выкарыстоўвалі дысцыплінарныя меры: карцар, пазбаўленне шпацыру, начныя малітоўныя трыванні і інш. Педагогі былі знаёмыя з дыдактыкай І. Г. Песталоцы (1746–1827), у прыхадскіх школах часта практыкавалася сістэма ўзаеманавучання навучэнцаў [6, s. 34].

Паводле ацэкі польскага даследчыка Підліпчак-Майяровіча М., у другой палове XVIII ст. базіліяне па колькасці школ і вучняў выйшлі ў Рэчы Паспалітай на трэцяе месца пасля езуітаў і піяраў [6, s. 38]. Пасля забароны дзейнасці ордэна езуітаў (1773 г.) да базіліянаў перайшлі багатыя езуіцкія бібліятэкі, рэдкія фізічныя кабінеты і школы.

У юрысдыкцыі базіліянскага ордэна была і прафесійная падрыхтоўка прыходскага ўніяцкага духавенства. Аднак, нягледзячы на шматлікія намаганні базіліанскага ордэна, у гэтым накірунку на беларускіх землях да 40-х гг. XVIII ст. не існавала спецыялізаваных семінарый для белага грэка-каталіцкага святарства.

**Заключэнне.** Такім чынам, да канца XVIII ст. пад юрысдыкцыяй базіліян функцыянавалі ўстойлівыя віды адукацыйных устаноў: навіцыяты, сярэднія і прыхадскія школы, у якіх навучаліся як манахі, так і свецкія вучні.

Высокі адукацыйны цэнз выкладчыцкага складу навіцыятаў і сярэдніх школ спрыяў увядзенню ў адукацыйны працэс перадавых для таго часу педагагічных практык: сістэмы ўзаеманавучання навучэнцаў, размеркавання вучэбнай нагрузкі, папулярызацыі фізічнай культуры.

У адрозненне ад езуіцкай адукацыйнай мадэлі, узятай базіліянамі за аснову, уніяцкія школы адчыняліся толькі пры кляштарах, на кіраўніцтва якіх ускладаліся ўсе клопаты па навучальнай установе.

Практычна ўся адукацыйная структура базіліянскага ордэна стваралася ў першую чаргу для падрыхтоўкі сваіх членаў, прыцягнення новых адэптаў ва ўніяцкую царкву і навучання свецкіх шляхецкіх юнакоў. У меншай ступені базіліяне клапаціліся пра навучанне выхадцаў з мяшчан і сялян.

## Літаратура

1. Климов С. Базилиане. Могилев: Могилев. гос. ун-т, 2011. 147 с.
2. Савич А. А. Западно-русские униатские школы XVII–XVIII веков // Труды Белорусского университета. 1922. № 2–3. С. 98–123.
3. Krasiński A. Prawo kanoniczne: krótko zebranie. Wilno: Druk. J. Żawadzkiego, 1861. 354 p.
4. Kania J. Unickie seminarium diecezjalne w Chełmie w latach 1759–1833. Lublin: Wydaw. Katolickiego Uniw. Lubelskiego, 1993. 360 p.
5. Коялович М. О. История базилианского ордена // Христианское чтение. 1864 январь. С. 11–75; апрель. С. 419–464.
6. Pidlypczak-Majerowicz M. Bazylianie w koronie i na Litwie: szkoły i książki w działalności zakonu. Warszawa: Pol. Wydaw. Nar., 1986. 272 p.
7. Марозава С. В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі 1596–1893 гг. Гродна: Гродзен. дзярж. ун-т, 2001. 352 р.
8. Кечкин И. Обзор деятельности Базилианского ордена (OSBM) в области просвещения (1613–1772 гг.) [Электронный ресурс]. URL: http://history-mda.ru/konf_25_26_dek_2010/obzor_deyatelnosti (дата звароту: 02.02.2019).
9. Петров Н. Очерк истории базилианского ордена в бывшей Польше // Труды Киев. духов. акад. 1872. № 1. С. 3–85, 161–272.

## References

1. Klimov S. *Baziliane* [Baziliane]. Mogilev, Mogilevskiy gosudarstvennyy universitet Publ., 2011. 147 p.
2. Savich A. A. West Russian Uniate Schools of the 17th–18th centuries. *Trudy Belorusskogo universiteta* [Proceedings of the Belarusian University], 1922, no. 2–3, pp. 98–123 (In Russian).

3. Krasiński A. *Prawo kanoniczne: krótko zebranie*. Wilno, Druk. J. Żawadzkiego Publ., 1861. 354 p.
4. Kojalovich M. O. History of the Basilian Order. *Khristianskoye chteniye* [Christian reading], 1864, January, pp. 11–75; April, pp. 419–464 (In Russian).
5. Kania J. *Unickie seminarium diecezjalne w Chełmie w latach 1759–1833*. Lublin, Wydaw. Katolickiego Uniw. Lubelskiego Publ., 1993. 360 p.
6. Pidlypczak-Majerowicz M. *Bazylianie w koronie i na Litwie: szkoły i książki w działalności zakonu*. Warszawa, Pol. Wydaw. Nar. Publ., 1986. 272 p.
7. Marozava S. *Uniyatskaya tsarkva u etnakul'turnym razvitstsi Belarusi 1596–1893* [Uniate church in the ethno-cultural development of Belarus, 1596–1893]. Grodna, Grodzenski dzyarzh. universitet. Publ., 2001. 352 p.
8. Kechkin I. *Obzor deyatel'nosti Bazilianskogo ordena (OSBM) v oblasti prosvyashcheniya (1613–1772 gg.)* [Education Review of the Basilian Order (OSBM) (1613–1772)]. Available at: http://history-mda.ru/konf_25_26_dek_2010/obzor_deyatelnosti (accessed 02.02.2019).
9. Petrov N. Essay on the history of the Basilian Order in former Poland. *Trudy Kiyevskoy dukhovnoy akademii* [Proceedings of the Kiev Theological Academy], 1872, no. 1, pp. 3–85, 161–272 (In Russian).

## Інфармацыя пра аўтара

**Масейчук Людміла Іванаўна** – кандыдат гістарычных навук, выкладчык кафедры філасофіі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт (220116, г. Мінск, пр. Дзяржынскага, 83, Рэспубліка Беларусь). E-mail: Mosejchuk@tut.by

## Information about the author

**Maseichuk Lyudmila Ivanovna** – PhD (History), lecturer, the Department of Philosophy and Political Science. Belarusian State Medical University (83, Dzerzhynskogo Ave., 220116, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: Mosejchuk@tut.by

*Паступіў 21.02.2020*